Наталля Хрытановіч

*7 мая 2013 г. былі падведзены вынікі XXI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2012 г.*



Вядучы бібліятэкар НДА бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# «БІБЛІЯТЭКА – АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ»

## *XXI РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС*

У конкурсе прынялі ўдзел 54 публічныя бібліятэкі: 29 цэнтральных і 25 бібліятэк-філіялаў, у тым ліку 23 сельскіх. Найбольшая колькасць матэрыялаў паступіла з Гродзеншчыны (15) і Міншчыны (14), з Брэсцкай вобласці – 7 работ, столькі ж прадстаўлена з Віцебскай і Магілёўскай. Бібліятэкі Гомельскай вобласці даслалі на конкурс 5 работ.

Наогул на конкурс было прадстаўлена шмат цікавых і разнастайных па ўвасобленых ідэях работ. У параўнанні з мінулым годам колькасць удзельнікаў конкурса павялічылася.

Амаль палова работ (23) была прадстаўлена ў намінацыі «**За пошукавую і даследчую працу**».

Па выніках пасяджэння журы першая прэмія прысуджана Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя І.Х. Каладзеева Мінскай вобласці (дырэктар Слесарэнка Г.М.) за работу, прысвечаную вывучэнню гісторыі вайны 1812 г. на Барысаўскай зямлі і ўвекавечванню памяці аб знакамітым земляку І.Х. Каладзееве. Супрацоўнікамі бібліятэкі быў распрацаваны інавацыйны праект «Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева – центр мемориальной деятельности», у рамках якога не толькі вывучалася гісторыя падзей 1812 г. на Барысаўшчыне, але і фарміраваліся ўласныя зборы па тэматыцы напалеонаўскіх войн. Зараз фонд бібліятэкі ўключае звыш 600 экз. дакументаў па гэтай тэме. Члены журы адзначылі глыбіню і дакладнасць пошукавай і даследчай дзейнасці супрацоўнікаў бібліятэкі.

Сярод сельскіх бібліятэк першую прэмію ў гэтай намінацыі атрымала Дубраўская сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці (бібліятэкар 1-й катэгорыі Бусел Л.Ф.). Людміла Фёдараўна ажыццявіла значную работу па пошуку, вывучэнні і аналітычнай апрацоўцы вялікай колькасці разнастайных крыніц, якія тычацца гісторыі в. Дуброва. На аснове здзейсненай навукова-пошукавай работы былі падрыхтаваны папкі-дасье «Дубраўская сельская бібліятэка – захавальніца народнай спадчыны», «Летапіс вёскі Дубрава», «Помнім усіх пайменна». Матэрыял суправаджаецца фотаздымкамі, архіўнымі дакументамі, картаграфічнымі дакументамі, успамінамі старажылаў.

Другая прэмія была прысуджана Мядзельскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя М. Танка Мінскай вобласці (дырэктар Нырцова Т.А.), якая ажыццяўляе сістэматычную работу па вывучэнні жыцця і творчай дзейнасці М. Танка. Вынік гэтай работы – база даных да 100-годдзя М. Танка, якая змяшчае запісы на артыкулы з перыядычных выданняў, энцыклапедый і іншых крыніц і налічвае 272 запісы; «Электронны фотаальбом», які налічвае звыш 400 фотаздымкаў; электроннае выданне «Паклон чалавеку і паэту: матэрыялы па папулярызацыі творчасці паэта-земляка Максіма Танка».

Другой прэміяй журы адзначыла і работу «Як напамін нашчадкам» Жытамлянскай сельскай бібліятэкі сеткі публічных бібліятэк Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці (бібліятэкар 1 катэгорыі Размысла Л.М.). Работа ўключае комплекс матэрыялаў і дакументаў па гісторыі в. Жытомля. Матэрыял сабраны падчас даследча-пошукавай работы, аб'ектыўна адлюстроўвае ўсе гістарычныя этапы ў развіцці в. Жытомля і ўключае архіўныя дакументы, фотаздымкі, публікацыі з перыядычных выданняў.

Трэцяя прэмія ў гэтай намінацыі была прысуджана Круглянскай цэнтральнай раённай бібліятэцы Шклоўскай сеткі публічных бібліятэк Магілёўскай вобласці (дырэктар Кавалеўская Т.К.) за аўтарскі праект «Зямля, якой ты часцінка» бібліятэкара аддзела абслугоўвання С.І. Вадап'ян.

Сярод сельскіх бібліятэк трэцяй прэміяй адзначана Люсінская сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці (загадчыца Літвіновіч З.І.).

22 работы было прадстаўлена ў намінацыі «**За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем**».

Першую прэмію ў гэтай намінацыі атрымала раённая дзіцячая бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці (загадчыца Нікіфарава М.Я.). Членамі журы была адзначана сістэмнасць і навуковасць падыхода да вызначанага кірунку дзейнасці. З мэтай удасканалення работы па прапагандзе нацыянальнай спадчыны сярод юных чытачоў бібліятэкай было праведзена анкетнае апытанне «Дзіцячая бібліятэка – асяродак беларускай культуры», па выніках якога быў распрацаваны комплекс мерапрыемстваў па папулярызацыі народнай спадчыны, выхаванні і стымуляванні цікавасці да беларускай кнігі, роднага слова. На працягу 2012 г. дзеці актыўна ўдзельнічалі ў розных мерапрыемствах і віктарынах. У сувязі з 130-годдзем з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа супрацоўнікі бібліятэкі правялі Купалаўскія тыдні і Коласаўскія чытанні. Былі апрабіраваны не зусім традыцыйныя формы прапаганды кнігі – кніжны міні-тэатр на стале: «Мы паказваем казку», чароўная скарбонка «Прачытаў цікавую беларускую кніжку – парай іншаму», кніжныя пасядзелкі вакол «мудрага» кубка, акцыя «Лепшыя дзіцячыя беларускія кнігі вачыма сучасных беларускіх пісьменнікаў». У бібліятэцы распрацаваны розныя мультымедыйныя прэзентацыі, відэаролікі і электронныя гульні.

Першае месца сярод сельскіх бібліятэк атрымала Залеская сельская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці (бібліятэкар 2-й катэгорыі Хрысціна М.П.) за далучэнне падрастаючага пакалення да нацыянальнай культуры, звычаяў, да эстэтычных і маральных каштоўнасцей. Добрым набыткам з'яўляецца збор народных святаў, звычаяў, характэрных для гэтай мясцовасці.

Залессе з даўніх часоў славіцца сваімі песнямі. Пад кіраўніцтвам М.П. Хрысціна дзецьмі было запісана больш за 30 народных песень, якія спявалі ў вёсцы, сабрана мноства казак, пачутых ад старых людзей, калыханак, забаўлянак, прыказак і прымавак. Вынікам гэтай руплівай працы сталі выданні серыі «Моўныя скарбы», «Замовы», «Прыказкі і прымаўкі». Працуе пры бібліятэцы аматарскае аб'яднанне «Гаспадыня», удзельнікамі якога з'яўляюцца як дарослыя, так і дзеці.

Другую прэмію атрымала Касцюковіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Чыгрынава Магілёўскай вобласці (дырэктар Мартыненка А.Я.) за руплівую і сістэматычную работу ў кірунку літаратурнага краязнаўства. З 1981 г. тут працуе аматарскае аб'яднанне «Літаратурная гасцёўня "Крынічка"». Дзейнасць аб'яднання скіравана на развіццё літаратурных талентаў, знаёмства з творчасцю мясцовых паэтаў і празаікаў, папулярызацыю твораў беларускіх аўтараў. Традыцыйна ладзяцца розныя святы паэзіі, вечарыны, якія прысвечаны знакамітым землякам.

Другая прэмія была прысуджана і Залескай сельскай бібліятэцы сеткі публічных бібліятэк Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці (бібліятэкар 1-й катэгорыі Пакалюк І.В.) за работу «Да вершаванага слова аб роднай старонцы». Сельская бібліятэка ўсклала на сябе важную місію – падтрымаць літаратурнае жыццё вёскі і дапамагчы юным аўтарам данесці сваё слова да чытачоў. Распрацаваны праект «Паэтычныя старонкі роднай вёскі», які скіраваны на выяўленне і аб'яднанне ў вёсцы таленавітых падлеткаў і развіццё іх творчых здольнасцей. У выніку рэалізацыі праекта з'явіўся аматарскі клуб «Дзьмухаўцы», на пасяджэннях якога падлеткі робяць першыя крокі па напісанні вершаў.

Трэцяя прэмія ў гэтай намінацыі была прысуджана Іўеўскай раённай дзіцячай бібліятэцы Гродзенскай вобласці (загадчыца Грыкень Т.І.) за мэтанакіраваную работу па папулярызацыі творчасці беларускіх пісьменнікаў, прыцягненне да чытання на роднай мове.

Сярод сельскіх бібліятэк трэцяя прэмія прысуджана сельскай бібліятэцы аграгарадка Леніна Горацкай сеткі публічных бібліятэк Магілёўскай вобласці (загадчыца Бялягіна І.Г.) за распрацаваную і ўкаранёную «Мадэль арганізацыі работы з падрастаючым пакаленнем».

У намінацыі «**За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы**» было прапанавана 9 работ. Пры гэтым адметнай рысай стала прадстаўленне новаўвядзенняў, што тычацца формаў правядзення мерапрыемстваў і метадаў іх арганізацыі, а не толькі тэхнічных і тэхналагічных навацый, як гэта было ў мінулыя гады.

Сярод гарадскіх бібліятэк першая прэмія была прысуджана Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы Мінскай вобласці (дырэктар Зіноўева С.У.) за распрацоўку і рэалізацыю праекта «Свята кнігі пад адкрытым небам», які прадугледжваў эстафетнае правядзенне святаў кнігі з ухілам на нацыянальны каларыт на базе буйных населеных пунктаў Бярэзінскага раёна. На ўсіх святах кнігі ўвазе наведвальнікаў прапаноўвалася перасоўная выстава-прагляд «2012 – Год кнігі». Выстава па чарзе перадавалася кожнай сельскай бібліятэцы сістэмы, дзе праходзіла знаёмства з беларускай кнігай і расказвалася аб дзейнасці беларускіх асветнікаў, чыталіся вершы знакамітых юбіляраў года і г. д. Удзельнікі бібліятэчных гурткоў паказвалі інсцэніроўкі з твораў беларускіх пісьменнікаў. І ўсё гэта праходзіла пад адкрытым небам на самым людным месцы населенага пункта, каб кожны з вяскоўцаў пачуўшы акорды святочнай музыкі, спяшаўся на свята.

Сельскія бібліятэкі былі таксама адзначаны ў гэтай намінацыі. Галоўчынская сельская бібліятэка-філіял № 12 Бялыніцкай сеткі публічных бібліятэк Магілёўскай вобласці (загадчыца Драчыкава Г.В.) атрымала першую прэмію за работу па стварэнні паўнатэкставай базы даных «Кароткая краязнаўчая энцыклапедыя Галоўчынскай зямлі», якая з'яўляецца электронным варыянтам аднайменнай друкаванай энцыклапедыі. Яна складаецца з чатырох самастойных частак: гістарычна-краязнаўчы даведнік «Ад сівой даўніны да нашых дзён», што ўтрымлівае прыведзеныя ў храналагічным парадку найбольш значныя даты ў гісторыі Галоўчынскай зямлі; гістарычнае падарожжа «Галоўчынскі сельскі Савет: гісторыі, падзеі, людзі», якое распавядае аб багатай на падзеі і лёсы людзей гісторыі Галоўчынскага сельскага Савета; гістарычны даведнік «Гісторыя калгаса "Наша Перамога"», які раскрывае яго амаль што векавую гісторыю, гістарычны экскурс «Светач мудрасці», што змяшчае матэрыялы аб народнай асвеце на Галоўчынскай зямлі.

Другую прэмію атрымала Цэнтральная гарадская бібліятэка імя К. Маркса ўстановы культуры «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г. Магілёва» Магілёўскай вобласці (дырэктар Краўчанка Г.І.) за праект «Жывая бібліятэка», які адбыўся ў рамках святкавання Дня горада. У якасці жывых кніг выступілі дзяржаўны служачы, байкер, праваслаўны святар і інш. Кожная «кніжка» распавядала сваю гісторыю, адказвала на пытанні чытачоў і наведвальнікаў бібліятэчнай пляцоўкі.

Другая прэмія была прысуджана таксама Даўжанскай сельскай бібліятэцы сеткі публічных бібліятэк Віцебскага раёна Віцебскай вобласці (загадчыца Даніленка І.А.) за распрацоўку краязнаўчага турыстычнага маршрута «Сцежкамі роднага краю».

Трэцяя прэмія прысуджана Аршанскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.С. Пушкіна Віцебскай вобласці (дырэктар Жвікава С.І.) за праект, рэалізаваны сумесна з гарадскім аўтобусным паркам, прысвечаны 130-годдзю знакамітых беларускіх песняроў Я. Купалы і Я. Коласа. Пры дапамозе «Аршанскага радыё» быў зроблены запіс вершаў класікаў беларускай літаратуры, які трансліраваўся ў гарадскіх аўтобусах.

Шмат бібліятэк – удзельніц конкурсу атрымалі заахвочвальныя прэміі. Практычна кожная конкурсная работа змяшчала ўласныя распрацоўкі, рэкламную і інфармацыйную прадукцыю. Большасць работ суправаджаліся электроннымі прэзентацыямі, відэаматэрыяламі аб рабоце бібліятэкі, распрацоўкамі гульнёвых праграм, сцэнарыямі і г. д.

Члены журы адзначылі, што плённа папрацавалі ўсе ўдзельнікі конкурсу. Бібліятэкары не страчваюць цікавасць да прапаганды нацыянальнай гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры. Пацвярджэннем гэтага служаць вынікі рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

Summary

The article is about the results of the XXI Republican contest "Library – a center of national culture".